**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за студзень 2018 г.

## <u>Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Ражства</u>

**10 студзеня**

У Калядны вечар бібліятэкары разам з актыўнымі чытачамі адправіліся віншаваць жыхароў вёскі. Падчас школьных канікул дзеці разам з бібліятэкарамі вывучылі калядныя вершы і калядныя шчадроўкі, вырабілі Віфлеемскую зорку. Калядуючыя павіншавалі аднавяскоўцаў і падарылі асвячоныя званочкі. На сабраныя юнымі артыстамі сродкі ў бібліятэцы было арганізавана салодкае чаяпіцце.

Дзівінскі філіял, 21 чал.

**11 студзеня**

У час правядзення экскурсіі-уроку “Библиотеку посещаем – любовь к книге прививаем” маленькія выхаванцы старэйшых і сярэдніх груп дзіцячага садка №4 пазнаеміліся з пакоямі бібліятэкі, паглядзелі лялечны спектакль “Новогодние приключения Колобка ”, прынялі ўдзел у конкурсна-гульнявой праграме “Волшебная шкатулка Зимы”. У канцы мерапрыемства адбылася дзіцячая дыскатэка.

Дзіцячы філіял, 65 чал.

**14 студзеня**

У рамках святочнай праграмы “Снова Рождество – сил небесных торжество” дзіцячы аматарскі клуб “Крынічка” прадставіў літаратурна-музычную кампазіцыю “Под сиянием Рождественской звезды”. Прадстаўленне суправаджалася відэапрэзентацыяй. Хор Петра-Паўлаўскай царквы і народны ансамбль песні “Залеская гамонка” парадавалі гледачоў каляднымі спевамі. Павіншаваўшы ўсіх са святамі, протаіерэй айцец Аляксандр ўрачыста завяршыў вечар. Да мерапрыемства арганізаваны кніжная выстава “У пошуках святога і вечнага” і выстава народнай творчасці “Рук залатых зямное харaство”.

Залеская ПБ, 180 чал.

**15 студзеня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшлі Калядныя вячоркі, удзельнікамі якога сталі члены Універсітэта Залатога веку. Прысутныя пазнаёміліся з гісторыяй беларускай культуры, даведаліся шмат цікавага пра старажытныя славянскія традыцыі святкавання Ражства Хрыстова, паслухалі народныя песні і музыку. Завяршылася мерапрыемства святочным чаяпіццем і вясёлымі танцамі.

ЦРБ, 42 чал.

**17 студзеня**

На вечары праваслаўнай паэзіі «Светлое Рождество нам счастье принесло» выхаванцы Васкрэснай школы і дзіцячага вакальнага кружка выканалі калядныя спевы і вершы. Прысутныя адказвалі на пытанні святочнай віктарыны, запальвалі калядныя свечкі. Жыхары вёскі выслухалі віншаванні ад старшыні Гарадзецкага сельвыканкама Д. Н. Міраненкі і іерэя Георгія Червякоўскага. У рамках штогадовай акцыі «Подари Рождество ребёнку» айцец Георгій ўручыў калядныя падарункі дзецям з абмежаванымі магчымасцямі, дзецям, якія выхоўваюцца ў шматдзетных сем'ях і дзецям з сем'яў, што знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы.

Гарадзецкі філіял, 120 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**5 студзеня**

На гульнявой праграме "День весёлых забав" выхаванцы дзіцячага саду пазнаёміліся з бібліятэкай і бібліятэкарамі. У гульні "Крутится, вертится шар голубой" знайшлі схаваныя літары, склалі з мазаікі вясёлага кацяня. Прэзентацыя "А вот и я!" дазволіла дзецям даведацца, што любіць кацяня, з кім сябруе. Пад канец мерапрыемства дзеці ўголас чыталі кнігу Мікалая Носава "Живая шляпа".

Дзівінскі філіял, 34 чал.

**5 студзеня**

У рамках раённага месячніка вернутай кнігі у бібліятэцы арганізаваны круглы стол для чытаючых сем'яў “Любоў да кнігі аб’ядноўвае нас”. Бібліятэкар расказала аб ролі чытання ў жыцці чалавека, правяла пазавальна-гульнявыя праграмы, прадэманстравала відэапрэзентацыю “Сямейнае чытанне: традыцыя ці неабходнацсь”. Завяршылася сустрэча салодкім сталом.

Навасёлкаўская ПБ, 27 чал.

**16 студзеня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла пазнавальная гадзіна «Маністы азёраў, лясоў таямніцы», прысвечаны Дню запаведнікаў і нацыянальных паркаў. Навучэнцы СШ №9 здзейснілі віртуальнае вандраванне па запаведных месцах Беларусі, даведаліся пра прадстаўнікоў флоры і фаўны запаведнікаў і нацыянальных паркаў свету, пра значэнне слоў «запаведнік», «заказнік», «нацыянальны парк». Ілюстрацыі мультымедыйнай прэзентацыі і відэафрагменты сталі выдатным дадаткам да апавядання вядучых.

ЦРБ, 25 чал.

**17 студзеня**

Да 80 –годдзя з дня нараджэння У.С. Высоцкага адбылося выступленне літаратурна-паэтычнай групы бібліятэкі «Мне менш за паўстагоддзя – сорак з лішнім...». Навучэнцы старэйшых класаў прачыталі свае любімыя вершы Высоцкага, пазнаёміліся з яго жыццём і творчым шляхам, праслухалі

запісы яго песен. Бібліятэкар аформіла кніжна-ілюстраваную выставу "Высоцкі. Паэт, спявак, акцёр, чалавек-легенда", на якой прадстаўлены біяграфічныя матэрыялы і фота Высоцкага з дамашняй бібліятэкі чытачкі Ліхавідавай Т.А. Расказ аб жыцці і творчасці паэта-песенніка суправаджаўся паказам відэапрэзентацыі.

Лукская ПБ, 35 чал.

**18 студзеня**

Для супрацоўнікаў публічных бібліятэк ДУК праведзены Круглы стол «Итоги 2017 и приоритеты 2018: цифры, факты, перспективы». Дырэктар ДУК азнаёміла прысутных з вынікамі працы сістэмы за 2017 год. Праведзены аналіз выканання планавых паказчыкаў 2017 г. публічнымі бібліятэкамі раёна, прадстаўлена відэапрэзентацыя «Палитра библиотечных мероприятий 2017 года». Сваімі ідэямі правядзення галоўных мерапрыемстваў 2018 года падзяліліся бібліятэкары публічных бібліятэк. Апошнім акордам мерапрыемства стала канцэртная праграма вакальнай групы цэнтральнай раённай бібліятэкі.

ЦРБ, 56 чал.

**26 студзеня**

Літаратурна-паэтычная група "Крыніца" прадставіла літаратурна-музычную кампазіцыю "Судьбу не обойти на вираже" для настаўнікаў і навучэнцаў сярэдніх і старэйшых класаў. Прысутныя праслухалі расказ аб жыцці і творчасці У. Высоцкага, фрагменты яго песен і прагледзелі відэапрезентацыю "Прерванный полёт". Да мерапрыемства арганізавана выстава літаратуры, прысвечанай У. Высоцкаму.

Імянінская ПБ, 76 чал.

**27 студзеня**

У цэнтральнай раённай бібліятэцы стартаваў новы сезон турніру па інтэлектуальных гульнях - «Свая гульня». З прывітальным словам да ўдзельнікаў гульні звярнуўся старшыня Кобрынскай раённай арганізацыі "Белая Русь", галоўны рэдактар газеты "Кобрынскі веснік" Мельнік Р.У.
У турніры спаборнічалі 9 каманд эрудытаў розных узростаў г. Кобрына і каманда «Особое мнение» з г. Бяроза. У напружаным змаганні прызавыя месцы занялі каманды: «Старики -разбойники» - 1 месца, «Сваякі» - 2 месца і «Особое мнение» - 3 месца, якія атрымалі прызы ад спонсараў інтэлектуальнай гульні. Мерапрыемства здымала абласное тэлебачанне.

Мерапрыемства суправаджалася музычнымі нумарамі.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81